# З акцэнтам на

## Уступная кампанія ў Беларусі пад пільным

**30 мая Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад аб уступнай кампаніі 2025 года. Кіраўніка дзяржавы традыцыйна цікавяць усе аспекты гэтага найважнейшага этапу для маладога пакалення беларусаў, а сёлета гэта больш за 56 тысяч чалавек. Таму сярод дакладчыкаў — міністр адукацыі Андрэй Іванец, віцэ-прэм'ер, які курыруе сацыяльную сферу, — Наталля Пяткевіч, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў і старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў.**

### «Мы трымаем у полі зроку арганізацыю экзаменаў»

Тлумачачы сутнасць гэтай размовы, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што хоць нюансы ўступнай кампаніі важныя, усё ж гэта не галоўнае. «Самае галоўнае — наша размова павінна прадэманстраваць людзям, насельніцтву, што мы трымаем у полі зроку на самым высокім узроўні працэс арганізацыі ўступных экзаменаў у ВНУ і экзаменаў па заканчэнні сярэдняга і базавага ўзроўню адукацыі. Асабліва паступленне ў ВНУ. Мы выдатна ведаем, якое значэнне мае дадзеная падзея ў сям'і, у адказнай сям'і. Самі праз гэта практычна ўсе праходзілі. Таму вельмі важна забяспечыць такую сістэму, якая б пераконвала нашых людзей у справядлівасці правядзення гэтай кампаніі», — патлумачыў ён.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як сёлета прайшоў цэнтралізаваны экзамен, ці апраўдала гэтае новаўвядзенне сябе. «Калі апраўдала, то ў чым? Толькі шчыра, — адзначыў беларускі лідар. — Калі дзесьці памыліліся, трэба гэтую сітуацыю выпраўляць, ні ў якім разе нельга яе рэтушаваць, таму што вельмі сур'ёзная справа».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сёлета ўступная кампанія не зведала значных змяненняў, праходзіць без новаўвядзенняў, па вызначаным алгарытме. Аднак, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, існуе няхай невялікі, але недабор на бюджэтныя месцы.

«Мы павінны прымаць меры, каб гэтыя месцы былі заняты. Мы ж рыхтуем, асабліва за кошт бюджэту, тых спецыялістаў, якія вельмі патрэбныя для народнай гаспадаркі, — адзначыў ён. — Мінадукацыі, урад, як у гэтым кірунку працуюць? Што зрабілі і што трэба зрабіць?»

Яшчэ адзін аспект, які вылучыў Прэзідэнт, — празрыстыя ўмовы правядзення іспытаў. «Цэнтралізаваныя экзамены, тэсціраванне — усё гэта добра. Але мы памятаем працэс здачы экзаменаў і становўча ацэньваем, калі выкладчык і абітурыент сядзяць насупраць і выкладчык бачыць гэтага абітурыента. Ці ўсё зроблена для такой празрыстасці? Таму што гэта галоўны элемент справядлівасці», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка не пакінуў без увагі і льготы пры паступленні. Ён пацікавіўся, як працуе гэты алгарытм, якія ёсць аб'ектыўныя праблемы. «Таму што я вас ведаю. Вы, хто сядзіць за гэтым сталом, людзі не толькі адукаваныя, але выдатнікі. І вы ўсё можаце ацэньваць са сваёй пазіцыі: веды, веды, вось не ведаеш — ідзі прэч... і да таго падобнае.

А ў выніку, вы памятаеце, калі мы заканчвалі ВНУ, слабакі (калі зыходзіць з гэтых крытэрыяў) аказваліся мацнейшымі за тых выдатнікаў, якія здавалі экзамены. Асабліва прыстасаваныя да жыцця, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Разумееце, пра што я кажу. Таму хацелася б пачуць тут вашу ацэнку».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў станоўчы досвед папулярызацыі прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У такія ўстановы павялічыўся набор, маладыя людзі імкнуцца паступіць у каледжы, тэхнікумы і прафтэхвучылішчы, што, па словах кіраўніка дзяржавы, не можа не радаваць. «Якія яшчэ дадатковыя меры трэба прыняць для таго, каб людзі ішлі атрымліваць прафесійна-тэхнічную адукацыю? І можа, на маім узроўні неабходна прымаць нейкія меры?» — пацікавіўся ён. Згодна з прадстаўленай кіраўніку дзяржавы інфармацыяй, сёлета на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 28 тысяч чалавек, што на 1,2 тысячы больш, чым у 2024 годзе.

Гаворачы ў цэлым аб ходзе ўступнай кампаніі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Я не сумняваюся, што будзе сумленна. Хоць несумленна і не было». «Не было», — пацвердзіў старшыня Камітэта дзяржкантролю.

### Веды плюс удача, і ніякіх хітрыкаў

«Проста патрэбна бацькам і абітурыентам разумець, што ўсё будзе справядліва. Не трэба ісці ні на якія хітрыкі. Прыходзіць у аўдыторыю для здачы экзаменаў неабходна са сваімі ведамі. Але ведаў замала, трэба яшчэ і каб удача была. Вось веды плюс удача — і будзеш вучыцца ў ВНУ», — параіў кіраўнік дзяржавы абітурыентам і іх бацькам. Ён звярнуў увагу, што заўсёды ёсць месца выпадковасці, форс-мажорам, але ў цэлым працэс прадуманы так, каб пазбегнуць выпадковасцей.

«І калі нешта здарыцца, мы павінны ўбачыць гэта. І паглядзець на тых людзей, якія, можа быць, да нас звернуцца, каб мы яшчэ раз зірнулі на іх веды. Не заўсёды ж бывае, як мы плануем, напэўна, дзесьці кагосьці страцім. Але страчваць мы не павінны. Не трэба ў гэтай сітуацыі крыўдзіць сям'ю і маладога чалавека, які толькі становіцца на нармальны жыццёвы шлях», — звярнуўся ўжо да адказных асоб кіраўнік дзяржавы.

### Якая сітуацыя на творчых спецыяльнасцях?

З нагоды гэтай актуальнай тэмы мы пацікавіліся асаблівасцямі паступлення на творчыя спецыяльнасці, дзе закладзены пэўныя падыходы, якія дазваляюць выбраць найлепшых. Варта падкрэсліць: адбор менавіта на творчыя спецыяльнасці мае такую асаблівасць, як творчы экзамен — ён вызначае многае, таму праблема справядлівага адбору тут у цэлым вырашаецца дзякуючы сапраўдным прафесіяналам. Да іх мы і звярнуліся, каб атрымаць інфармацыю з першых вуснаў.

**Наталля КАРЧЭЎСКАЯ, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

— У асноўным нашы абітурыенты праходзяць унутраныя іспыты па дысцыпліне «творчасць» — у іх межах нам прасцей зрабіць выбар і разгледзець талент у залежнасці ад выканання заданняў. Ужо на гэтым этапе мы можам меркаваць пра тое, наколькі сур'ёзна чалавек зацікаўлены ў будучай прафесіі. Многія з тых, хто паступае да нас, ужо маюць падрыхтоўку ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах альбо досвед удзелу ў занятках аматарскай творчасцю на даволі высокім узроўні, то-бок маюць азы прафесійнай падрыхтоўкі. Таму нашы абітурыенты, як правіла, высока матываваны, а нам прасцей зрабіць выбар, арыентуючыся не толькі на падлік балаў цэнтралізаваных экзаменаў.

Правілы прыёму прадугледжваюць магчымасць для найбольш таленавітай часткі творчай моладзі паступаць наогул без здачы ўступных экзаменаў. Гэта тычыцца перш за ўсё лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама абітурыентаў, якія сталі пераможцамі

# справядлівасць

## кантролем на самым высокім узроўні




*Фота з архіва БелТА.*

творчых спаборніцтваў, уключаных у пералік конкурсаў, што даюць права на атрыманне вышэйшай адукацыі без здачы ўступных экзаменаў (а ў нас даволі вялікі працэнт такіх абітурыентаў). Вельмі радуе, што «Дэнс кангрэс», які праводзіць БДУКМ, таксама ўваходзіць у пералік такіх конкурсаў. Канешне, конкурсы даюць добры стымул. Таленавіты чалавек разумее, што калі ён удастоены высокага звання лаўрэата альбо Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, альбо конкурсу, то ў яго добрыя адукацыйныя перспектывы. І мы зацікаўлены ў падтрымцы такіх юнакоў і дзяўчат.

Пры тым, што лічбы прыёму ў нашу ВНУ не змяншаюцца, у нас даволі высокі конкурс. Каб ацаніць абітурыентаў больш справядліва, у прыёмную камісію акрамя сваіх выкладчыкаў стараемся ўключаць прадстаўнікоў арганізацый заказчыкаў — аўтарытэтных дзеячаў культуры, якія могуць паглядзець збоку і адчуць асобу. Творчыя ВНУ зацікаўлены ў тым, каб выбіраць найлепшых, бо нам іх вучыць, а потым і працаваць разам у адной сферы.

**Алена САКАЛОВА, дэкан мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. Машэрава:**

— Асноўнай задачай нашага факультэта з'яўляецца падрыхтоўка выкладчыкаў, педагогаў-мастакоў для ўстаноў адукацыі і культуры, мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайнераў. Гэтым тлумачыцца асаблівасць у адборы абітурыентаў. Ёсць правілы прыёму, згодна з якімі бяруцца да ўліку адзнакі, атрыманыя як на цэнтралізаваных тэсціраваннях, так і на творчым іспыце, праз які праходзяць нашы абітурыенты. Маюць значэнне усе складнікі, але ёсць свае асаблівасці пры паступленні на кожную спецыяльнасць. Справа ў тым, што падлік балаў на спецыяльнасць «дызайн» і падлік балаў на педагагічную спецыяльнасць ідуць па-рознаму. Пры паступленні на спецыяльнасць «дызайн» ці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» ўлічваецца сярэдні бал атэстата, вынікі двух ЦТ (па мове і гісторыі Беларусі), але дадаюцца два іспыты па творчасці — тут гэтыя адзнакі даволі важкія. Пры паступленні на спецыяльнасць «мастацкая адукацыя» таксама ўлічваецца сярэдні бал атэстату і адзнакі па двух ЦТ, плюс вынік творчага экзамену — але тут яго вага ў агульнай адзнацы складае ўсяго адну чацвёртую. Раней на педагагічную спецыяльнасць экзамен па творчасці складаўся з двух этапаў: малюнак і жывапіс альбо малюнак і кампазіцыя. Канешне, адбор быў больш грунтоўны, чым цяпер, калі маем ўсяго адзін экзамен па творчасці. Але ў нас на факультэце працуюць прафесіяналы, якія ўмеюць разглядзець талент і ацаніць патэнцыял. У нас выкладаюць сябры творчых арганізацый краіны — Беларускага саюза мастакоў, саюза дызайнераў, саюза народных майстроў. Сярод педагогаў — вядомыя мастакі, скульптары, дызайнеры. Гэта людзі, якія жывуць творчасцю і адчуваюць творчы патэнцыял у іншых. Як правіла, калі чалавек таленавіты, то ў яго добры бал пры паступленні па экзамене «творчасць».

Цікавасць да мастацкай адукацыі з боку абітурыентаў ёсць, штогод мы набіраем патрэбную колькасць студэнтаў на ўсе спецыяльнасці. І пры размеркаванні запатрабаванасць у нашых выпускніках таксама ёсць.

**Валерыя СЦЯЦКО**
**Ларыса ЦІМОШЫК**